View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository



*УДК 821.161.3:82–1 М. Танк*

**А. Ч. Мойскі,**
*аспірант кафедры беларускай літаратуры і культуры*

# «ВАМ МЯНЕ ХІБА НЯМА ЧАГО СЛУХАЦЬ»: СТЭРЭАТЫПЫ ГІСТАРЫЧНАГА КАНТЭКСТУ І ПАЭЗІЯ МАКСІМА ТАНКА

Калі пісьменнік прыўносіць у паэзію рэаліі з уласнага жыцця, водгукі падзей гісторыка-культурнай эпохі, тады і мастацкі твор, рэагуючы на знешнія фактары рэчаіснасці, напаўняецца дадатковымі сэнсамі. Сацыяльна-палітычныя ўмовы, біяграфія аўтара ўплываюць на мастацкі свет пісьменніка і разам утвараюць кантэкстуальную прастору яго паэзіі. Адначасова гэта судакрананне часам спрыяе ўзнікненню розных стэрэатыпаў ва ўспрыманні асобы аўтара і яго творчасці.

Са сферы жыцця і штодзённага побыту на мастацкі свет пісьменніка ўплываюць і яго выказванні па-за літаратурнага характару, і яго дзённікавыя запісы, і эпісталярная спадчына. Пытанне аб магчымасцях прыцягнення гэтых звестак да аналізу літаратурнага твора з'яўляецца дыскусійным. Але несумненна, што такое даследаванне пашырае прастору яго навуковага вывучэння, паколькі ўзбагачаецца непасрэдна мастацкі свет пісьменніка. Аналіз шматлікіх узроўняў кантэкстуальнай прасторы, калі выкарыстоўваць розныя метадалагічныя прынцыпы і падыходы, дае ключ да разумення аўтарскай пазіцыі, мэты яго творчасці, выяўленай у творы, асаблівасцей мастацкага метаду або метадаў, рэалізаваных пісьменнікам. Пагадзімся, што разуменне многіх твораў проста немагчыма па-за кантэкстам.

Гэтыя выказванні і дзённікавыя запісы часам замацоўваюць пэўны стэрэатып, што для разумення некаторых твораў з'яўляецца зусім неабавязковым элементам, а часам і непажаданым. Аднак, у час паўсюднай інфарматызацыі грамадства любыя факты становяцца агульнавядомымі і, здаецца, звыклымі для ўспрымання. Такім чынам, першасная задача навукоўцаў заключаецца ў найбольш падрабязным і шырокім вызначэнні кантэкстуальнай прасторы творчасці пісьменніка, у фармулёўцы таго, у якім кантэксце пажадана вывучаць твор, а дзе гэтага кантэксту варта пазбегнуць. Тады пытанні, якія ўзнікаюць пры аналізе твора, атрымаюць не аднабаковыя, але разгорнутыя, шматстайныя адказы з тлумачэннямі, абумоўленымі вызначаным кантэкстам.

Акрэсліць гістарычную эпоху стварэння мастацкага тэксту з'яўляецца адной з першых задач даследчыка. Часам гэта можа не мець пад сабой ніякай неабходнасці, а толькі замацоўвае стэрэатыпы і абмяжоўвае пісьменніка пэўнымі рамкамі. Так, пры ўспрыманні паэзіі Максіма Танка нават слабаадукаваны чытач можа зразумець, што даверасня̈ўская лірыка паэта нечым адрозніваецца ад яго паэзіі пасляваенных гадоў. Пры гэтым час даволі адвольна фарміруе гісторыка-культурны фон мастацкага твора. У сувязі з наяўнасцю гэтага кантэксту праблема, што стаіць перад навукоўцам, заключаецца ў тым, ці варта даследаваць гэты фон або наколькі ўсеахватна ўлічваць яго.

Прысутнасць вечных тэм і вобразаў пераконвае, што прывязка да гістарычнай эпохі часам можа перашкодзіць успрыманню мастацкага тэксту. Напрыклад, «вечныя» філасофскія пытанні, якія падымаюцца Максімам Танкам у савецкую эпоху, сёння ўспрымаюцца ідэалагізавана, паколькі гэта была эпоха дамініравання ідэалаў камунізму і паэт быў сярод адданых гэтым ідэалам творцаў. Яго ж паэзія канца 80-х – пачатку 90-х гг. у часы культурнага адраджэння ўспрымалася і ўспрымаецца сёння як чыстая філасофская паэзія, хоць філасофскія матывы з'явіліся ў Максіма Танка значна раней.

Споўнілася 50 гадоў кнізе вершаў «Глыток вады», якая выйшла ў савецкі час. У ёй безліч антытэз і аксюмаранаў. Гэтыя мастацкія сродкі, супрацьпастаўленні жыцця – смерці, дабра – зла і іншыя адвечныя пытанні вызначаюць філасофскую скіраванасць вершаў, рэпрэзентуюць аўтарскую свядомасць паэта-філосафа. Так, у «Трактаце аб паэзіі», які міжвольна адсылае нас да Нікала Буало, Жоашэна Дзю Беле і іншых аўтараў тэарэтычных трактатаў, Максім Танк піша: «Не забывайце ж / Пра век, у які мы жывём: <…> Паміж глытком жывой вады і атрутнай» [1, т. 3, с. 256].

Рэпазіторый БДПУ

Такім чынам, узнікае шмат пытанняў у сувязі з неабходнасцю вывучэння твора ў гістарычным кантэксце. Безумоўна, мастацкі твор мае дачыненне да пэўнай эпохі. Жыццё аўтара можа прыпасці як на частку эпохі, так і на мяжу некалькіх эпох, якія ў сукупнасці складаюць нацыянальную гісторыю. А яна ў сваю чаргу павінна разглядацца ў кантэксце сусветнага гістарычнага працэсу. Таму мастацкі свет нараджаецца на той жа самай цывілізацыйнай глебе, нацыянальнай і сусветнай, прыналежнасць да якой адчувае і перадае ў сваіх творах паэт.

Разам з тым гістарычны кантэкст можа не мець такога выключнага значэння пры аналізе «вечных» пытанняў, што прагучалі ў творах, хоць у гэты час ён меў свае ўплывы на станаўленне і развіццё светапогляду аўтара. Дзяцінства, юнацтва і маладосць Максіма Танка прыпадаюць на рэвалюцыйныя падзеі і сусветныя войны, што не магло не выпрацаваць і не загартаваць у ім адметныя ідэйна-эстэтычныя прынцыпы і цвёрдую жыццёвую пазіцыю. Сваім перакананням паэт не здраджваў і на працягу наступных гадоў жыцця. Імі ён кіраваўся і ў сваёй творчасці: «Я знаю, што страшэнна адстаў / ад свайго часу: <…> Не навучыўся штодня мяняць сваіх поглядаў, / Хварэю на старую хваробу сэрца / І працягваю пісаць у рэалістычным стылі» [1, т. 5, с. 119].

У той жа час гістарычны кантэкст не павінен падмяняць сабой літаратурную творчасць, якая не можа і не павінна выступаць у якасці ілюстрацыі да гістарычных падзей. Максім Танк часта ўзнаўляе ў сваіх творах справы мінулых гадоў і стагоддзяў:

Прыехалі асаднікі, паны.
Азёры пахнуць ім не толькі рыбай,
Яны глыбей упушчаюць кіпцюры
У нашы нівы,
Ў прадзедаў сялібы,
І ў нашы песні, і ў лясы-бары [1, т. 7, с. 53].

У гэтых радках паэт называе прычыны паўстання рыбакоў у 30-х гг. у тых месцах, дзе ён нарадзіўся, на яго малой бацькаўшчыне. Аўтар прыгадвае адну са старонак сваёй біяграфіі – турму, – адрасуючы сённяшнія радкі мінуламу і сучаснаму. «І я цябе бачыў… / Ці не на Лукішках?» [1, т. 7 с. 18–19], ці «Тут пранюхае, можа сачыць / Дэфензіўская лютая зграя» [1, т. 7, с. 33]. Падрыхтоўка паўстання апісваецца паэтам у рэальных гістарычных абставінах і сапраўдных геаграфічных межах – на азёрах суседняй Вілейшчы: «Так разбівалі / Свае путы-гора / Азёры: / Нарач, / Мястра і Баторын» [1, т. 7, с. 21–22].

Калі ў паэме «Нарач» Максім Танк апісвае рэальныя гістарычныя падзеі, то ў паэме «Каліноўскі» большае месца займае фантазія. Нельга ўспрымаць як гістарычны факт тое, што, напрыклад, Кастусь Каліноўскі пад псеўданімам Вітаўта Вітажэнца прысутнічаў на плошчы падчас пакарання сваіх сяброў, і толькі снег на твары схаваў слёзы рэвалюцыянера, якія маглі яго выдаць. Пры аналізе апошняй паэмы варта звярнуцца да гістарычнага кантэксту дзеля таго, каб зразумець сапраўдную эстэтычную вартасць твора, каб акрэсліць маштабнасць падзей, іх значнасць і сказаць пра трагічны лёс іх удзельнікаў. Аўтар раскрывае ўнутраны свет персанажаў, узнаўляе магчымыя матывы іх учынкаў, выдумляе памкненні і пачуцці, якія характарызуюць герояў. Але пры гэтым не губляюць сваёй вартасці іх палітычныя погляды, а яны добра вядомыя гісторыкам. Максім Танк робіць толькі палітычныя намёкі ў сваёй паэме: «… а за пазухай Герцэн, / ў сэрцы «Колакала» калыхаўся прызыў» [2, с. 104]. Гістарычны кантэкст дазваляе расшыфраваць гэтыя намёкі, алюзіі на гістарычныя факты і абставіны. Наша знаёмства з імі яшчэ больш абвастрае ўспрыманне карцін, намаляваных паэтам.

Гістарычны фон паказвае, наколькі небяспечным і складаным быў працэс прыняцця рашэнняў героямі твора. Мы бачым стан прыгнечаных сялян, разумеем неабходнасць змагання з прыгонным правам. Але разам з тым у творы гучыць думка пра немагчымасць вырашэння гэтага пытання без падтрымкі нізоў, у ім сказана пра класавую прыналежнасць паўстанцаў і пра жорсткасць царызму. Той не ведае міласці і бязлітасна распраўляецца з людзьмі, а сярод катаў – вісельнік Мураўёў і яму падобныя, такія як Палкоўнік Лосеў з паэмы «Каліноўскі»:

Гора складае свае калыханкі –
Сумныя песні пра чорны прыгон [2, с. 97].

Гэта значыць, што твор Максіма Танка прарываецца праз эпохі і злучае адзін ланцужок падзей з іншымі ў кантэксце нацыянальнай гісторыі, а тым самым, з дапамогай мастацкага тэксту, упісвае беларускую гісторыю ў сусветны гістарычны працэс. Вобраз рэвалюцыянера, які мяняе жыццё на адданасць ідэі, добра вядомы як у літаратуры, так і ў гісторыі. А канфлікт паміж абавязкам перад Радзімай, перад народам і асабістым шчасцем з'яўляецца распаўсюджаным матывам не толькі ў нацыянальнай, але і ў сусветнай літаратуры. Прыгадаем вобраз горкаўскага Данка, які вырваў сваё сэрца, каб асвятліць шлях свайму народу.

Многапакутны народзе ты мой,
Хутка убачыш светлае ранне,
Сонца свабоды па-над зямлёй! [2, с. 97].

Рэпазіторый БГПУ

Такім рэвалюцыйна скіраваным бачыцца і вобраз казачнага Вяля («Сказ пра Вяля»). Калі сяляне просяць героя вывесці іх з-пад прыгнёту хоць на край зямлі, то волат заклікае да змагання з ворагам. Казачнае абрамленне гэтага вобраза ў творы (нараджэнне ў разоры, разуменне мовы птушак і жывёл, магутная багатырская сіла), процістаянне сялян князю адсылае чытача да ранейшага гістарычнага перыяду. Але сам «Сказ» успрымаецца як універсальны для любога часу. Нездарма ў канцы твора Максім Танк звяртаецца да сваіх сучаснікаў: «Нам пара зноў сілы новыя збіраць, / Тапары і косы адвастрыць ізноў нам, / Каб з зямлі гаротнай путы пазрываць!..» [2, с. 63].

Безумоўна, гістарычны кантэкст толькі дапамагае пры аналізе твора. Але ён не можа служыць адзінай метадалагічнай асновай літаратуразнаўчага аналізу. У першую чаргу твор павінен разглядацца ў кантэксце творчасці самога аўтара. А калі нават узгадаць пра слова-мікравобраз, то і яно можа разглядацца ў кантэксце пэўнага твора як мікракантэкст. Макракантэкстам з'яўляецца ўся творчасць аўтара ў кантэксце нацыянальнай літаратуры, якая ў сваю чаргу ўваходзіць у сусветны літаратурны працэс. Гэта шматузроўневасць літаратурных сюжэтаў і вобразаў знаходзіцца ў іншай плоскасці ў дачыненні да гістарычнага кантэксту. Але гэтыя плоскасці, мастацкая і гістарычная, перасякаюцца. І толькі ў гэтых міждысцыплінарных кропках судатыкнення можна карэктна і поўнавартасна вызначыць сутнасць літаратурнага твора.

Прыступаючы да аналізу літаратурнага твора, трэба азнаёміцца з асаблівасцямі гістарычнага часу яго напісання. Так, давераснёўская лірыка Заходняй Беларусі характарызуецца тым, што на яе паўплывалі як ціск польскай дэфензівы, так і падпольная дзейнасць Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі. Не менш важна ўлічыць і тую спадчыну, што пакінула пасля сябе папярэдняя эпоха выхаду першых легальных беларускіх газет, дзейнасць літаратурных суполак, як і працэс беларусізацыі. З творамі Янкі Купалы, Якуба Коласа, М. Багдановіча быў знаёмы Я. Скурко. Таму творчасць самога аўтара трэба памножыць на той здабытак, што застаўся ад мінулых пакаленняў, сярод іх, безумоўна, і Ф. Багушэвіч, і В. Дунін-Марцінкевіч. Апошнія згадвалі ў сваіх творах пра сацыяльную няроўнасць, расказвалі пра пакутлівыя няроўныя шлюбы падчас прыгону.

Сюжэт паэмы «Журавінавы цвет» Максіма Танка створаны пад уплывам традыцый папярэднікаў. У яго сацыяльна-бытавой драме да сялянскай дзяўчыны заляцаецца ўжо не паніч і не эканом, а ўлан-асаднік, вядомы з заходнебеларускіх рэалій. Гэты герой паказаны жорсткім і ваяўнічым («Улан устаў бялей як палатно. / – Мо дзе спаткаемся, стары, мы зноў / – Глядзі, каб не зліняла барада!» [2, с. 46]) і нагадвае эканома з паэмы В. Дуніна-Марцінкевіча «Гапон», які браніцца, а можа і аплявуху адпусціць. Пад уплывам нацыянальнай літаратуры і вуснай народнай творчасці Максім Танк стварае арыгінальныя мастацкія вобразы, якія добра вядомыя з жыцця і літаратуры і разам з тым маюць асаблівыя, перастворанымя аўтарам прыкметы. Небезпадстаўна можна сцвярджаць, што без міжлітаратурных сувязей, без пераемнасці традыцый не можа паўнавартасна існаваць і развівацца нацыянальная літаратура. Але ж і самім паэтам уласціва цяга да наватарства, а для Максіма Танка ці не ў найбольшай ступені.

У наш час трэба пазбавіцца стэрэатыпу, што пісьменнікі савецкай эпохі падзяляліся на дзве катэгорыі – на тых, хто пасля ўз'яднання застаўся будаваць светлы шлях да сацыялістычнай дзяржавы, і тых, хто апынуўся ў эміграцыі. Справа палітолагаў даваць характарыстыкі ці ствараць стэрэатыпы кіраўнікоў краін. А ў кожнага творцы свой жыццёвы лёс, і ён, разам з палітычнай сітуацыяй, абумоўлівае спецыфіку яго творчасці, у рознай ступені фарміруе асаблівасці яго мастацкага свету. Сёння мы маем магчымасць пазнаёміцца з такімі творамі, як «У кіпцюрох ГПУ» Ф. Аляхновіча, ведаем лёс рэпрэсаваных пісьменнікаў, даты смерці якіх у савецкіх энцыклапедыях з 1937 г. доўгі час замяняліся гадамі вайны, ведаем пра дзейнасць чырвоных алоўкаў цэнзараў у пасляваенную эпоху. Але разам з тым бачым і рост пісьменніцкага майстэрства аўтара, яго здольнасць нават у самых неспрыяльных умовах ствараць шэдэўры. Да такіх геніяў, безумоўна, адносіцца Максім Танк. Сацыяльна-палітычная сітуацыя, вядома, уплывала на яго аўтарскую свядомасць асабіста і на яго грамадскую свядомасць у цэлым. Але нас цікавіць не стан эканомікі і палітыкі, а ўзровень філасофскай думкі, стан культуры ў часы яго жыцця.

Творчую асобу аўтара не варта разглядаць як сукупнасць ведаў, атрыманых ім дзякуючы адукацыі, кнігам, яго знаёмству з творамі мастацтва, або як суматыўную множнасць літаратурных сувязей, якая звязала яго з папярэдняй традыцыяй. Творчасць выдатнага мастака-паэта – унікальная і арыгінальная з'ява, якая нарадзілася на глебе перапрацоўкі ўбачанага, пачутага, вывучанага, прачытанага. Пісьменнік нараджаецца праз назіранне народнага жыцця, традыцый і звычаяў, маральных і эстэтычных нормаў, праз сузіранне

Рэпазіторый БДПУ

прыроды і ад перажывання гістарычных трагедый, рэвалюцый і войн. Так, паэтычную душу Максіма Танка ўскалыхнулі нарачанскія сосны, азёры, лясы, уся тая прыгажосць, якою так адметна яго Мядзельшчына: «За песні і сасонкі, / Узгоркі і даліны – / Люблю цябе я звонка, / Люблю цябе, краіна!» [2, с. 31]. Гэта вельмі складаны працэс – нараджэнне творцы, і яго праца – праца па пераасэнсаванні гістарычных рэалій, з'яў навакольнага жыцця ў неўміручых мастацкіх вобразах выступае яе сапраўдны феномен.

Яшчэ адной памылкай у інтэрпрэтацыі гісторыка-культурнага кантэксту, што паўплываў на літаратурную творчасць паэта, з'яўляецца тое, што на паэтаў савецкай эпохі вешаецца ярлык рэалістычнага мастацтва. Маўляў, што калі ў лірычнага героя ёсць рэальны прататып, значыць, перад намі паэт – прадстаўнік сацрэалізму. Але ж зразумела, што часам устанаўленне прататыпа не толькі не дапамагае пры аналізе твора, а і ўскладняе яго. Так, стварэнне светлага вобраза мадонны, спраектаванага на канкрэтную жанчыну ў біяграфіі мастака, пазбаўляе яе арэолу ідэальнай чысціні і паўнавартаснай красы, збядняе сам твор. «Глядзіць набожна на крыж пятровы, / А я малюся на яе бровы: / Няўжо, красуня, ты не шкадуеш, / Што хараство і жыццё марнуеш? / Як танцавалі б ножкі такія, – / Ave Maria!» [2, с. 285]. Тут у першую чаргу мы павінны зазірнуць у творчую лабараторыю пісьменніка, вызначыць, што мела першаснае і непасрэднае дачыненне да стварэння вобраза. У гэтай працы могуць дапамагчы чарнавыя запісы, зробленыя паэтам, а таксама розныя рэдакцыі яго твора. Захапленне жаночым хараством (Максім Танк у радках чарнавога машынапісу называў ножкі манашкі, то «смуглявымі», то «стройнымі») і рэнесанснае ўслаўленне мадонны з дзіцём (аўтар у чарнавіках рупліва падыходзіць да выбару кожнага слова – закрэслена «О, як люляла б малога сына» і надпісана «І калыхала б сваю дзяціну» [1, т. 3, с. 351]) выходзіць на першы план, а імкненне аўтара да антырэлігійнай прапаганды – чарговы стэрэатып, як і тое, што прадстаўнікі метаду сацыялістычнага рэалізму імкнуліся да бесчалавечнасці формы і толькі выкрывалі капіталістычныя тэндэнцыі.

Першаасновай кантэкстуальнай прасторы творчасці пісьменніка з'яўляецца літаратурны кантэкст. Кожны твор паэта ў першую чаргу супастаўляецца з іншымі яго творамі – гэта базавы ўзровень кантэкстуальнай прасторы. На ім можна выявіць заканамернасці, уласцівыя ўсёй творчасці пісьменніка, вызначыць у ёй пэўную праблематыку, асаблівасці стылю і г. д.

Супаставім вершы Максіма Танка з першага зборніка «На этапах». Нягледзячы на пакуты, шыбеніцы, астрогі, стражнікаў, бізуны, катоўні, якія выпалі на долю лірычнага героя, ва ўсіх вершах гучаць заклікі да змагання, надзеі на іскру бунта, што вызваліць свабодную песню з прыходам вясны. Менавіта гэтымі ідэямі вызначаюцца першыя зборнікі Максіма Танка. І толькі сабраныя разам, яны ўзнаўляюць карціну змагання заходнебеларускай інтэлігенцыі, у той час калі паасобку вершы не ствараюць такога агульнага ўражання. А недасведчаны чытач, прачытаўшы асобны верш, увогуле наўрад ці адназначна патлумачыць, пра якое змаганне ідзе размова, пра які час з гісторыі краіны піша паэт.

Юбілейны зборнік «Глыток вады» багаты на прыклады міжлітаратурных, міждысцыплінарных узаемадзеянняў. Відавочна, што глытком жывой вады для Максіма Танка становіцца народная творчасць, мінуўшчына роднага краю, гэтаксама як і бягучы час ва ўсёй яго складанасці і шматфарбнасці. І хоць застаецца шэраг стэрэатыпаў успрымання і тлумачэння і твораў пісьменніка, і асаблівасцей гістарычнага працэсу, але ўсе яны лёгка разбіваюцца, калі мы маем справу з сапраўдным творцам. А творца – гэта той, хто наладжвае ланцугі – з гісторыяй і мастацтвам, з суайчыннікамі і прадстаўнікамі іншых культур. Справа ж даследчыка – вывучаць творы паэта ў кантэксце як нацыянальным, так і сусветным, як канкрэтна-гістарычным, так і з «папраўкай на вечнасць». Адзінае, што не падвяргалася за гэты час сумненню, – гэта народнасць паэзіі Максіма Танка, народнага паэта Беларусі.

Літаратура

1. *Танк, М.* Поўны збор твораў : у 13 т. / М. Танк. – Мінск : Беларус. навука, 2006–2012.
2. *Танк, М.* Ключ жураўліны / М. Танк. – Мінск : Беларусь, 1972. – 496 с.

Summary

*Methodological basis – scientific research of the works of foreign and national literary theorists and critics (M. Bahtin, R. Barth, Y. Lotman, Y. Kristeva, A. Volkov, H. Adamovich, L. Borshchevski, P. Vasyuchenko, E. Leonova, M. Tychyna, I. Shablovskaya etc.).*

*Stereotypes in a historical context that make many erroneous views and opinions that we find in the study of poetry Maxim Tank's poetry. The study of contextual space of the art author's world is a new and relevant topic in literary criticism. It has a lot of interliterary and interdisciplinary connections.The study of Maxim Tank's poetry in the historical context aims to: represent the poet-philosopher of authors of socialist realism; to determine the author's position and the author himself; to recognize the place of literary imagination in the description of historical events; to define the*

Рэпазіторый БДПУ

*value of its contribution to national history and literature; to state the influence of predecessors. A study in the historical context helps to show the need and the uselessness of many methods of literary analysis (research the diaries, biographical and epistolary, historical and cultural background, political views and author's citizenship).*

Паступіў у рэдакцыю 08.07.2015 г.

*УДК 821.111(73) К.Мэзер*

***А. Л. Церковский,***
*аспирант кафедры русской и зарубежной литературы БГПУ*

# «ВЕЛИКИЕ ДЕЯНИЯ ХРИСТА В АМЕРИКЕ» КОТТОНА МЭЗЕРА КАК ПРИМЕР ПУРИТАНСКОЙ ЛИТЕРАТУРНОЙ РЕФЛЕКСИИ

Изучение американской литературы колониального периода – одно из приоритетных направлений в современной американистике [1–5]. Формирование и становление аутентичной художественной традиции США – процесс, который в силу многих историко-культурных причин существенно отличается от формирования европейской литературной традиции. Исследование художественно-документальных работ первых поселенцев, выходцев стран Европы, в основном Англии, имеет большое значение для изучения специфики литературного процесса США.

Одним из самых влиятельных и незаурядных представителей новоанглийской словесности был доктор Коттон Мэзер – проповедник, богослов, историк, биолог, политический и церковный деятель, автор множества биографий, эссе, хроник, проповедей и нравоучительных писем. Вопрос о его литературном статусе остается достаточно дискуссионным, что повышает актуальность данного исследования.

Литературовед Э. Эллиотт анализирует самую известную работу К. Мэзера – «Великие деяния Христа в Америке» (Magnalia Christi Am ericana, 1702) – как книгу, в которой описываются «два конфликтующих понимания Америки – духовное и материалистическое – которое он пытался примирить, признавая, что каждое из них стремится подавить другую» [6, p. 277]. Исследователь описывает сочинение К. Мэзера в контексте формирования новоанглийской традиции литературной иеремиады.

Российский литературовед Б. Гиленсон в книге «История литературы США» относит сочинения К. Мэзера к разделу «теологической литературы» и пишет о «Великих деяниях» как о главном труде К. Мэзера, отмечая, что «В основе книги – биографии наиболее значительных деятелей пуританизма в Новой Англии» [7, с. 22].

По задумке автора, структура «Деяний» похожа на Священное Писание: сочинение разделено на два тома (Volume I / Volume II) (в которые входят соответственно книги 1–3 и 4–7), равно как и Библия состоит из Ветхого и Нового Заветов, обладающих тематическим единством. Каждая книга К. Мэзера содержит в себе множество глав и подглав, посвященных самым разным событиям и людям; это приближает композиционный строй «Деяний» к Ветхому Завету (который состоит из идейно связанных, но тематически различных книг, например, пророческие, поэтические книги, книги мудрости и т. д.), что и было в задумке К. Мэзера, так как главная библейская аллюзия в этом сочинении – образ избранного народа, которым в Ветхом Завете являются евреи. Нужно отметить, что парадигма пуританского мировоззрения формировалась преимущественно на ветхозаветной образной системе, несмотря на то, что пуританизм – христианская деноминация. Придавая текстам Ветхого Завета важное историческое значение, К. Мэзер опираясь на ветхозаветную образность, творчески переосмысливает историю израильского народа и создает историю «нового» человечества, историю «новых избранных» – пуритан.

Большое внимание в «Деяниях» К. Мэзер уделяет первой и второй книгам Паралипоменон, название которых некоторые историки переводят как «летописи, хроники». Это важно для понимания влияния библейского текста на творчество К. Мэзера, который сам называл себя летописцем. Интерес к этой книге автора «Деяний» неслучаен: исторический контекст в книгах Паралипоменон охватывает историю возвращения евреев из вавилонского плена в Обетованную Землю в три этапа (при Зоровавеле, Ездре и Неемии), что идеально подходило к идейно-художественной задумке К. Мэзера (описание трудностей пуритан при эмиграции из Англии на американский континент). Как и в первой книге Паралипоменон, в «Деяниях» идет перечисление выборочных родословных (у К. Мэзера – «святых» Новой Англии), описывается история властителей Новой Англии (в книге Паралипоменон описывается иудейскя монархия). Эти книги Ветхого Завета фигурируют в «Деяниях» в синкретичной при-

Репозиторий БГПУ